# НА МАРМУРЫ — СЯБРЫ

Яшчэ адным матэрыяльным сведчаннем аб знаходжанні на Лунінеччыне вядомых людзей стала больш. Свята ў Любані пачалося з адкрыцця на будынку Дома культуры памятнай дошкі. Выкарыстаны для яе два партрэты, якія змешчаны ўверсе (фота 60-х гадоў. А фотаздымак унізе А.Макаёнка і У.Сцепчанкі ў час нейкай урачыстасці друкуецца ўпершыню). Тэкст на дошцы (яе адкрылі сын А.Макаёнка Сяргей Андрэевіч і настаўнік Любанскай СШ С.П.Нефідовіч) наступны: «У перыяд з 1959 па 1974 гады Любань і наваколле неаднаразова наведваў славуты драматург, народны пісьменнік Беларусі Андрэй Ягоравіч Макаёнак. Прататыпам галоўнага героя яго п'есы «Таблетку пад язык» стаў тагачасны старшыня калгаса «Новае Палессе» Герой Сацыялістычнай Працы Уладзімір Апанасавіч Сцепчанка». На дошцы яны побач — сябры з дзяцінства.

***Фота Т.СОЦ***
***і з сямейнага архіва У.СЦЕПЧАНКІ.***



Родная слова
Запрашаем на свята